# ГРАФ КАНСТАНЦІН ТЫШКЕВІЧ: ВУЧОНЫ, АРХЕОЛАГ, КРАЯЗНАЎЦА

## Культурнаасветніцкая дзейнасць старажытнага беларускага роду



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар

**Старажытны род Тышкевічаў славуты на Беларусі паслядоўнай, шматграннай, часта наватарскай культурнаасветніцкай дзейнасцю, якую ажыццяўлялі з пакалення ў пакаленне яго прадстаўнікі. Пра аднаго з іх – графа Канстанціна Тышкевіча, заснавальніка беларускай навуковай археалогіі, гісторыка, этнографа, стваральніка першага нацыянальнага музея старажытнасцей – наш сённяшні аповед.**

### Традыцыі славутага роду

У XVI ст. шэраг прадстаўнікоў феадальнай арыстакратыі на беларускіх землях атрымлівае ад германскіх імператараў і польскіх каралёў графскі тытул. Напрыклад, у Міры тытул графа атрымаў Юрый Шчаснавіч Ільініч, у Шклове – Ян Геранім Хадкевіч, у Нясвіжы – Радзівілы, Сапегі. У 1569 г. у Лагойску стаў графам Васіль Тышкевіч.



З гэтага роду паходзяць знакамітыя дзяржаўныя, ваенныя, грамадскія дзеячы Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Так, у XVIII ст. Ян Тышкевіч, ад якога бярэ пачатак беларуская лінія графскага роду, быў старостам стшалкоўскім, Феліцыян быў генерал-маёрам войска Вялікага Княства Літоўскага і старостам стшалкоўскім, у першай палове XIX ст. Дамінік і Пій Тышкевічы – маршалкамі шляхты Барысаўскага павета, а Уладзіслаў Тышкевіч быў дэпутатам Дзяржаўнай думы Расіі.



Прадстаўнікі роду Тышкевічаў мелі значныя зямельныя надзелы ў Ковенскай, Віленскай, Мінскай, Кіеўскай губернях. Напрыклад, на землях сучаснай Беларусі ім належалі маёнткі Валожын і Лагойск. Але ў гісторыі нашай краіны Тышкевічы засталіся не толькі як уладальнікі вялікіх маяратаў. Беларуская графская лінія Тышкевічаў дала сваёй радзіме таксама славутых навукоўцаў, даследчыкаў матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа, дзеячаў мастацтва. У Еўропе ў 20-х гг. мінулага стагоддзя было добра вядома імя кампазітара Яна Тышкевіча. На сродкі ўладальнікаў Валожына і Лагойска былі ўзведзены збудаванні, якія пазней атрымалі статус архітэктурных помнікаў. У 1806 г. граф Юзаф Тышкевіч замовіў архітэктару А. Касакоўскаму праект палаца-паркавага ансамбля, які быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узведзены на высокім беразе ракі Валожынка. Комплекс складаўся з мураванага палаца, бакавых флігеляў і рэгулярнага парка, які спускаўся да ракі. У гэтым жа горадзе на сродкі графа Юзафа ў 1816 г. пабудаваны мураваны касцёл у стылі класіцызму. Палац і касцёл захаваліся да нашага часу і як помнікі гісторыі і архітэктуры знаходзяцца пад аховай дзяржавы.

У 1814–1819 гг. уладальнікі Лагойска ўзводзяць двухпавярховы палац у італьянскім стылі, а побач, уздоўж ракі Гайна, па іх ініцыятыве разбіваецца дзівосны парк. У ім былі пасаджаны каля трохсот відаў раслін, а сярод іх – такія экзатычныя дрэвы, як белая таполя, пенсільванскі ясень, сібірская лістоўніца, серабрысты клён, залацістая ліпа і інш. У парку дзейнічаў фантан з круглым вадаёмам.

У гэтым цудоўным кутку ў сям'і графа Пія Феліцыянавіча і нарадзіўся ў 1806 г. першынец Канстанцін. Пазней графская сям'я папоўніцца яшчэ двума сынамі – Яўстафіем і Фларыянам, а таксама дачкой Паўлінай. Маці Канстанціна, Аўгуста, была высокаадукаванай жанчынай. Яна захаплялася калекцыяніраваннем гістарычных дакументаў, у яе калекцыі былі ўнікальныя рукапісы. Бацька калекцыяніраваў творы выяўленчага мастацтва, пісаў сямейную хроніку, збіраў бібліятэку, займаўся археалагічнымі раскопкамі. Пій Феліцыянавіч цудоўна іграў на скрыпцы і флейце, часта ладзіў у сваім палацы камерныя і сольныя канцэрты, быў выдатным рэзчыкам па дрэве і інкрустатарам. Граф Тышкевіч сябраваў з вядомым музыкантам XIX ст. Восіпам Казлоўскім, кампазітарам і піяністам Фларыянам Міладоўскім. У палацы гучала музыка Гайдна і Моцарта. Частым госцем у Лагойску быў і такі слынны мастак і музыка, як Напалеон Орда (ён, дарэчы, пакінуў выразную замалёўку палаца Тышкевічаў). Шмат часу аддаваў Пій Феліцыянавіч вывучэнню роднага краю. Удзячнасцю і прызнаннем яго заслуг у навуцы было абранне графа ў 1856 г. – у 100-гадовым узросце! – ганаровым членам Віленскай археалагічнай камісіі.

Любоў да бацькаўшчыны, яе старажытнай гісторыі і культуры імкнуўся Пій Феліцыянавіч прывіць і сваім сынам – старэйшаму Канстанціну і малодшаму Яўстафію. Безумоўна, Канстанцін атрымаў па тым часе грунтоўную адукацыю. Ён вучыўся ў Полацкім езуіцкім, Забельскім дамініканскім калегіумах, Віленскім універсітэце. Пасля заканчэння ўніверсітэта (1828 г.) пэўны час працаваў у міністэрстве фінансаў Царства Польскага.

### Малады гаспадар, археолаг

У 1836 г. Канстанцін Тышкевіч пакідае службу і пасяляецца ў Лагойску. Тут ён пачынае гаспадарчыя рэформы, сур'ёзна вывучаючы тэарэтычную літаратуру і вопыт арганізацыі сельскай гаспадаркі ў краінах Заходняй Еўропы, дзе бываў па службовых справах. На адкрытую ім фабрыку льняных і баваўняных тканін Канстанцін Тышкевіч запрашае спецыялістаў з Германіі, якія навучаюць 85 мясцовых рабочых выраблясць якасную тканіну. Малады гаспадар наладжвае таксама ліцейную вытворчасць і тым самым забяспечвае мясцовае насельніцтва неабходнымі ў гаспадарцы жалезнымі прыладамі. Але гаспадарчымі справамі дзейнасць графа Канстанціна не абмяжоўваецца. Большую частку сваіх сіл і сродкаў часу ён аддае навуцы, вывучэнню матэрыяльнай і духоўнай культуры Міншчыны.

Лагойск з яго старажытным замкам, рассеяныя навокал замчышчы, гарадзішчы і курганы часоў дахрысціянскай мінуўшчыны выклікалі вялікую цікавасць графа. З вывучэння лагойскіх старажытнасцей і пачаў ён сваю навукова-археалагічную і краязнаўчую дзейнасць. Не зважаючы на графскі тытул, Канстанцін, яго брат Яўстафій, а часам і бацька бралі ў рукі рыдлёўкі і з дапамогай навакольных сялян раскопвалі старажытныя курганы. Археалагічная навука тады знаходзілася на самым пачатку свайго развіцця. Сяляне, якіх запрашалі весці раскопкі, курганы лічылі недатыкальнымі аб'ектамі. Пазней Яўстафій Тышкевіч прыгадваў: «Я павінен быў шчодра сыпаць грошы сялянам і разам з імі працаваць, каб ўзяць на сябе грэх» [4, с. 47]. Імкнучыся разгадаць загадкі старажытнасці, Тышкевічы вырашылі грунтоўна разабрацца ў тыпах гістарычных помнікаў на роднай зямлі і высветліць, ці ёсць у іх сувязь з культурай плямён, што некалі жылі на тэрыторыі Беларусі.

### Авалоданне навуковымі метадамі

З мэтай авалодання навуковымі метадамі археалагічных і гістарычных даследаванняў Тышкевічы неаднойчы наведвалі Данію, Фінляндыю і Швецыю. Нягледзячы на шматлікія складанасці, навукоўцы змаглі даследаваць каля 200 курганоў, гарадзішчаў і замчышчаў ў Мінскай губерні [3, с. 551]. Абапіраючыся на свае даследаванні і сапраўды энцыклапедычныя веды, Канстанцін напісаў абагульняльныя капітальныя працы «О курганах в Литве и Западной Руси» і «Исторические сведения о замках, городищах и курганах в Литве и Руси Литовской». Яны былі выдадзены ў 1865 г. У гэтых працах аўтар імкнуўся даць максімальна магчымы ў той час аналіз пахавальнага інвентару і канструкцый пахавальных збудаванняў. Ён спрабаваў класіфікаваць курганныя насыпы.

Але галоўнай заслугай К. П. Тышкевіча перад археалагічнай навукай стала распрацоўка





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

методыкі раскопак кургана. Ён сфармуляваў асноўныя правілы і паставіў галоўную задачу даследавання насыпу: «Чтобы напластования были с точностью рассечены и обнаружены верно слои, из которых они сложены. Чтобы скелет и утварь были показаны на своем месте» [6, с. 15]. Манументальныя працы графа-археолага выклікалі вялікую цікавасць у тагачасных навуковых колах. К. П. Тышкевіча абіраюць членам Парыжскага геаграфічнага таварыства, Этнаграфічнага таварыства Усходняй Амерыкі, Маскоўскага археалагічнага таварыства.

З цягам часу К. П. Тышкевіч прадоўжыў вывучэнне роднага краю за межамі Лагойшчыны. Ён збіраў звесткі па гісторыі Астрашыцкага Гарадка, Барысаўскага павета, Заслаўя, іх старадаўніх забудоў. Упершыню К. Тышкевіч увёў у краязнаўчую практыку складанне тапаграфічных планаў замкаў і гарадзішчаў на беларускіх землях. Так, ім былі зроблены планы замкаў у Заслаўі, Чашніках, Уле, Біржах, Лагойску, Рудніку, Свідне, Дабрынёве, Баравым Млынку, Сукромне. Навуковая каштоўнасць такіх тапаграфічных планаў відавочная, паколькі фіксаваўся стан помніка да раскопак і пасля іх, як гэта бачна на прыкладзе Лагойска і Заслаўя. Аўтар падмацоўваў свае назіранні малюнкамі аб'ектаў. Метад К. Тышкевіча ўзялі на ўзбраенне і іншыя даследчыкі, у прыватнасці А. Кіркор і У. Сыракомля. Пазней складанне тапаграфічных планаў стала абавязковым этапам раскопак. Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што К. П. Тышкевіч праводзіў сапраўды навуковыя, а не аматарскія даследаванні і што яго з поўным правам можна лічыць заснавальнікам айчыннай археалогіі.

Адначасова з археалогіяй граф Тышкевіч грунтоўна займаўся і вывучэннем фальклору. Пераапрануўшыся ў сялянскае адзенне, ён хадзіў па вясковых хатах, каб паслухаць і запісаць народныя песні, легенды, паданні, паўдзельнічаць у абрадах. Гэтаму графу была ўласцівая важная для этнографа рыса – уменне знаходзіць падыход да простых людзей. «Адпраўляючыся ў падарожжа з мэтай зносін з простымі вясковымі людзьмі, пераходзячы ад адной хаты да другой, каб пачуць ад людзей паданні, легенды і песні, трэба было мець тое, чым можна было іх адорваць, чым спадабацца, чым закрануць сэрца мясцовых жыхароў», – пісаў ён [9, с. 6]. Граф Канстанцін адзначаў, што беларусы вельмі адкрытыя і добразычлівыя, яны ахвотна ішлі на кантакт, цэлымі вёскамі сустракалі даследчыка: «Колькі разоў я быў жаданым госцем для людзей усіх саслоўяў, што жывуць на берагах чароўнай Віліі. Як толькі прышвартоўвалася наша судна – адусюль прыбягалі натоўпы людзей мне насустрач» [9, с. 29]. У 1857 г. К. П. Тышкевіч арганізаваў на ўласныя сродкі экспедыцыю па рацэ Віліі. У Лагойску былі пабудаваны тры судны: «Марыя», «Ад'ютант» і «Выгада». Яны волакам былі дастаўлены да вёскі Камена, адкуль і пачалося падарожжа. За чатыры месяцы ўдзельнікі экспедыцыі пераадолелі 682 вярсты – ад Вілейкі да Коўна. Падчас падарожжа яны наведалі каля 300 вёсак і мястэчак. Фальклорны, этнаграфічны і археалагічны матэрыял, сабраны ў ходзе экспедыцыі, стаў асновай кнігі Канстанціна Тышкевіча «Вілія і яе берагі», апублікаванай у Дрэздане ў 1871 г. [9]. Гэта была адзіная ў Еўропе манаграфія, створаная на падставе даследавання этнічнага рэгіёна шляхам падарожжа па рацэ. Кніга аздоблена графічнымі малюнкамі Артура Бартэльса, якія ён зрабіў прама ў час сумеснага падарожжа па Віліі. Ёсць пераклад гэтай унікальнай працы на літоўскую мову, будзем спадзявацца, што з'явіцца і пераклад на беларускую. У манаграфіі змешчаны апісанні вясельных абрадаў, святочных рытуалаў Дзяды, Каляды, Радуніца, Спас, усяго цыкла гаспадарчага гадавога каляндара беларусаў.

Шмат цікавага аб традыцыях беларусаў можна было даведацца ў корчмах. У манаграфіі налічваюцца 23 эпізоды, дзе апісваюцца ігрышчы ў корчмах з прыпеўкамі, народнымі танцамі, гульнямі, тэатралізаванымі дзеямі. Дарэчы, сацыякультурныя функцыі карчмы адзначаў у свой час і Якуб Колас. Так, у паэме «Сымон-музыка» паэт апісваў масавыя святочныя гулянні-ігрышчы: «Тут ігрышчы адбывалісь / Перад святамі зімой. / Танцавалі маладыя, / Весяліліся, пілі, / Скокі, гульні тыя / Многа радасці няслі» [5, с. 373]. Падчас вандроўкі па Віліі ўдзельнікі экспедыцыі імкнуліся на начлег спыняцца ў корчмах. Аўтар кнігі зазначае: «Нам, стомленым пасля напружанага дня, такі начлег, бясспрэчна, не быў зручным, але калі ўжо пайшлі зносіны з вясковым людам, то гэтыя карчомныя гулянні трэба таксама лічыць праявай мясцовых звычаяў. З іх мне давялося ў сваім падарожжы пачынаць вывучэнне звычаяў нашага народа». К. П. Тышкевіч вельмі каларытна апісвае, напрыклад, традыцыйныя беларускія танцы «Мяцеліца», «Скакуха», «Круцёлка», «Лявоніха», якія ўбачыў менавіта ў корчмах.

Цэлую главу прысвяціў К. Тышкевіч народным песням – «Пра песню гмінную». Як прызнаецца сам аўтар, ён не меў на мэце сказаць штосьці новае пра народную песню, а толькі хацеў на падставе параскіданых па розных кніжках цытат і паведамленняў сістэматызаваць іх: як і калі з'яўляліся, якія ў розныя часы мелі арэал выканання. У дадатку да манаграфіі змешчаны тэксты ста запісаных Тышкевічам у

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

розных мясцовасцях песень. «Песня народная — была літаратурай, як паданні і легенды былі першай яго гісторыяй, насельнікі таго краю жывуць ураджаннямі ўнутранага жыцця і перадаюць яго праз свае песні» [9, с 293]. У канцы сваёй кнігі К. Тышкевіч заключае, што славянскі народ вясёлы і жыццярадасны, умее і працаваць, і весяліцца.

## Калекцыі ў радавым маёнтку

Значная колькасць этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, сабраных удзельнікамі падарожжа па Віліі, прадметаў, знойдзеных сям'ёй Тышкевічаў пры раскопках, а таксама артэфактаў з іх хатняй калекцыі твораў народнага мастацтва сталі асновай першага ў Беларусі гісторыка-археалагічнага музея, адкрытага ў радавым маёнтку ў Лагойску у 1842 г. П. Шпілеўскі ў захапленні пісаў: «Особенно замечателен в Логойске помещичий архив, заключающий в себе коллекцию книг, медалей и разных предметов искусств и художеств» [8, с. 33]. Пад экспазіцыю было адведзена тры пакоі, дзе ў адпаведнасці з устаноўленымі музеёлагамі правіламі размяшчаліся экспанаты. Сучаснікі адзначалі, што ўсё ў музеі «каталагізавана і знаходзіцца ва ўзорным парадку» [2, с. 34]. Такі ўзровень экспазіцыі забяспечыла карпатлівае вывучэнне графам Канстанцінам музейнай справы ў Даніі, Швецыі і іншых заходнееўрапейскіх краінах. Тагачасных навукоўцаў М. Балінскага, А. Кіркора, І. Крашэўскага ўражвала разнастайнасць і багацце лагойскага музея. Толькі нумізматычная калекцыя Тышкевічаў налічвала 1140 медалёў і манет. Сярод трох тысяч кніг, сабраных у бібліятэцы музея, было каля 500 старажытных помнікаў айчыннага кнігадрукавання, 1060 старажытных грамат [1, с. 6]. У музеі захоўваліся старадаўнія зброя, вырабы майстроў разьбы па дрэве, унікальная калекцыя ручнікоў, сурвэтак, абрусаў. Аб багацці яго фондаў сведчыць такі кароткі пералік: баявы сцяг шведскай арміі, старажытная зброя, каля 200 карцін вядомых італьянскіх мастакоў, копіі старажытнагрэчаскіх твораў, а таксама карціны Яна Рустэма і Яна Дамеля, працы навагрудскага скульптара Рафала Слізеня, калекцыя старых мапаў [7, с. 175]. Найбольш каштоўнай рэліквіяй у зборы Тышкевічаў лічыўся крыж, падараваны каралём Жыгімонтам Старым касцёлу ў мястэчку Гайна. Вялікую каштоўнасць уяўлялі таксама два мячы з пазалочанымі выявамі Стэфана Баторыя і шпага Пятра I. Значнае месца ў зборы графаў займалі партрэты прадстаўнікоў дванаццаці пакаленняў лагойскага адгалінавання роду Тышкевічаў, этрускія вазы і іншыя антыкварныя прадметы з раскопак у Пампеі і Геркулануме, Егіпце, творы мастацтва з Рыма, Фларэнцыі, Неапаля і інш. П. Шпілеўскі ўзгадвае таксама 48 копій барэльефаў грэчаскага Парфенона [8, с. 174].

Музей у Лагойску быў даступны і для проста цікаўных наведвальнікаў, і для навукоўцаў. Так, І. Крашэўскі пры напісанні сваёй манаграфіі аб старажытным мастацтве шырока выкарыстоўваў матэрыялы з маёнтка Тышкевічаў. Функцыянаванне Лагойскага музея паказала, што беларусы актыўна цікавяцца гісторыяй айчыннай і сусветнай культуры. Змест экспазіцыі садзейнічаў усталяванню ў свядомасці наведвальнікаў важнай думкі пра нацыянальную самабытнасць і гістарычную непаўторнасць Беларусі.

## Віленскі музей старажытнасцей

У тагачасным Лагойску пражывала дзве тысячы жыхароў, а наведвальнікаў з іншых гарадоў і мястэчак было ўсё ж небагата. Таму запаветнай марай графа Канстанціна Тышкевіча было стварыць на тэрыторыі Беларусі першы грунтоўны музей старажытнасцей на падставе экспанатаў, якія меліся ў іх Лагойскім маёнтку. Ідэю гэтую горача падтрымалі брат Яўстафій, М. Балінскі, І. Нарбут, У. Сыракомля. У 1845 г. частку лагойскай калекцыі Я. Тышкевіч перавёз у Вільню і наладзіў на яе падставе выстаўку. У 1852 г. браты адправілі ў Пецярбург ліст з просьбай дазволіць ім адкрыць у Вільні музей. Царскія чыноўнікі падрабязна вывучылі ўсе акалічнасці і ў 1853 г. накіравалі аўтарам ліста дазвол на стварэнне музея ў Вільні. Браты Тышкевічы і іх добраахвотныя памочнікі з энтузіязмам узяліся за стварэнне экспазіцыі Віленскага музея старажытнасцей. Яго мэтамі былі абвешчаны: збор старажытных кніг, актаў, рукапісаў, манет, медалёў, зброі, статуй і іншых прадметаў культуры, якія адносіліся да гісторыі Паўночна-Заходняга краю Расіі, садзейнічанне захаванню помнікаў старажытнасці, забеспячэнне магчымасці карыстацца імі дзеля вывучэння краю не толькі ў гістарычных, але і ў гандлёвых, прамысловых, сельскагаспадарчых і стратэгічных адносінах. Віленская археалагічная камісія ў спецыяльным звароце прасіла ўсіх зацікаўленых асоб рабіць ахвяраванні на карысць музея старажытнасцей. На заклік адгукнуліся прыхільнікі дзяржаўна-культурнага адраджэння. Так, У. Сыракомля перадаў музею нумізматычную і геральдычную калекцыі, а таксама кнігі. Каштоўныя рукапісы і рарытэты ахвяравалі М. Балінскі, А. Кіркор, Т. Нарбут, І. Крашэўскі, І. Ходзька. Знайшліся і іншыя ахвяравальнікі, якія лічылі за гонар аддаць свае зборы антыкварных рэчаў дзеля папаўнення экспазіцыі створанага музея. Так, Марцін Капуцкі з Маладзечна даслаў знойдзены ім скарб манет колькасцю каля 100 штук [4, с. 40].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Віленскі музей старажытнасцей быў адкрыты ў 1856 г. у памяшканні бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. На ўрачыстай цырымоніі прысутнічалі простыя гараджане, людзі, якія ўдзельнічалі ў папаўненні экспазіцыі, ганаровыя госці з Вільні і іншых гарадоў – усяго каля 300 чалавек. Да прысутных звярнуўся граф Канстанцін Тышкевіч. Ён адзначыў важнасць падзеі для адраджэння гісторыі і культуры краю і падзякаваў шматлікім мецэнатам, якія ахвяравалі музею матэрыяльныя каштоўнасці і грошы.

І пасля адкрыцця экспанаты працягвалі паступаць з Мінска, Магілёва, Віцебска, Оршы, Навагрудка, Крэва, Ліды, Пінска, Браслава, Паставаў. Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы перадалі музею сваю бібліятэку (3 тыс. кніг) і археалагічную калекцыю (2 тыс. адзінак). За 2 гады калекцыя музея дасягнула 10 тыс. экспанатаў. Яго папулярнасць хутка расла, аб чым сведчыла павелічэнне колькасці наведвальнікаў.

На базе музея яго супрацоўнікі актыўна займаліся навуковай дзейнасцю. Іх даследаванні атрымалі прызнанне калег у Маскве, Кіеве, Кракаве, Адэсе і інш. Але, на жаль, праіснаваў музей толькі 10 гадоў. Прычынай яго ліквідацыі стала паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Улады, напалоханыя паўстаннем, пачалі разглядаць музей як адзін з цэнтраў так званай польскай інтрыгі.

У 1864 г. музей рэвізавала створаная генерал-губернатарам М. Мураўёвым Віленская археаграфічная камісія. Экспанаты былі прызнаны шкоднымі, музей быў афіцыйна забаронены. Яго экспанаты канфіскавалі і разаслалі па розных гарадах Расіі. Так, Румянцаўскаму музею ў Маскве было перададзена 5995 нумізматычных адзінак (18 залатых манет, 3948 сярэбраных, 1997 медных, 14 бронзавых медалёў, 18 асігнацый) [1, с. 41]. У Гістарычны музей ў Маскве трапілі матэрыялы раскопак 1862 г. курганоў каля в. Мідагошча Мінскага павета. Усяго з музея было вывезена каля 800 каштоўных экспанатаў, у тым ліку скульптурная група «Ядвіга і Ягайла», 56 партрэтаў-эстампаў польскіх каралёў, 160 партрэтаў прыватных асоб, 93 гравюры з абразоў, 203 карціны на гістарычныя сюжэты, цэхавы сцяг Вільні, зброя і амуніцыя вояроў эпохі Айчыннай вайны 1812 г. і інш. Частку археалагічных знаходак граф Тышкевіч перадаў музею археалогіі ў Кракаве, а калекцыю шкла эпохі Рымскай імперыі – Народнаму музею ў Варшаве. Дагэтуль у Львоўскім музеі ўкраінскага мастацтва захоўваюцца экспанаты Віленскага музея старажытнасцей: абразы ў багатай ажурнай аправе, малюнак мастака У. Валькевіча – партрэт Яўстафія Тышкевіча.

І ўсё ж, нягледзячы на непрацяглы час свайго існавання, Віленскі музей старажытнасцей стаў свайго роду грунтам для фарміравання беларускай навуковай эліты. Даследаванні яго супрацоўнікаў спрыялі развіццю археалогіі, этнаграфіі, гістарыяграфіі і мастацтва Беларусі.

Не на шмат гадоў перажыў музей яго стваральнік. У 1868 г. ва ўзросце 62 гадоў Канстанцін Тышкевіч памёр. Выдатны вучоны, асветнік, ён усім сэрцам любіў сваю радзіму і свой народ, ганарыўся яго багатай культурай, даследаваў яе і ўсімі сродкамі рэпрэзентаваў этнакультурныя каштоўнасці, сімвалы і сэнсы. У якасці запавета нам, сваім нашчадкам, граф Канстанцін пакінуў словы: «Любіце зямлю, што дала нам жыццё, якая ў старасці корміць хлебам, якая не адкажа ў апошнім прыстанішчы. Кожны з нас, хто хоць колькі мае сілы, павінен для сваёй зямлі, для навукі ўнесці сваю долю» [9, с. XV].

## ЛІТАРАТУРА


1. **Другія Тышкевіцкія чытанні:** зб. матэрыялаў / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 109 с.
2. **Ельскі, А.** Выбранае / А. Ельскі; уклад. Н. Мазоўка, У. Казберук [і інш.]. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004.
3. **Караў, Д.** Тышкевіч Канстанцін Піевіч / Д. Караў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пузыны – Усая / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2001. – 591 с.
4. **Каханоўскі, Г. А.** Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 118 с.
5. **Колас, Я.** Збор твораў: у 14 т. Т. 6. Паэмы «Новая зямля», «Сымон- музыка» / Я. Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – 624 с.
6. **Тышкевич, К.** О курганах в Литве и Западной Руси / К. Тышкевич. – Вильно, 1865.
7. **Федорук, А. Т.** Старинные усадьбы Минского края / А. Т. Федорук. – Минск: ООО «Полифак», 2000. – 415 с.
8. **Шпилевский, П. М.** Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск: Беларусь, 2004. – 250 с.
9. **Tyskewicz, Konstanty Hr.** Wilija i jej brzegi. Pod wzgledem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / Konstanty Hr. Tyskewicz. – Drezno: Drukiem i Nakladem J.I. Kraszewskiego, 1871. – 362 s.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ